Міхась Скобла



…Гэй, каго паром праз раку вязе?

Як плывецца вам на маёй сьлязе?..

# Летапісны ловіцца радок

## ВЕЧАР ПЕРАД КАЛЯДАМІ

Ціха, як на бязьлюднай планеце.
Мароз без разбору
Лезе да ўсіх цалавацца.
У хатах вясковых
У грубках і печах
Разьвітаюцца з жыцьцём дрэвы:
Як васковая, растае сасна,
Сіпяць спалоханыя асіны,
Адстрэльваецца елка,
Бяроза пацьвельваецца з агнём,
Пасьпяваючы пакінуць тастамант
На скручанай закуранай бяросьце…

Дымы падымаюцца з комінаў
І стаяць над сьцішэлаю вёскай:

Цэлы лес цёплых
Прывідна-хісткіх дрэваў.

У высокай кроне
Мосьціцца нанач
Нябачны пугач,
Прыплюшчыўшы
адно вока.

## ТРЫ СЬЛЯЗЫ

Ах, якія слаўныя маразы!
Прымярзьлі да месяца тры сьлязы.

Тры бяды, тры роспачы, тры душы,
Тры на смак салёныя ледзяшы.

Сонца промень кінула раз і два –
Не сагрэла месячнага сяйва.

Зоркі неба крэсьлілі давідна –
Ды ня стала крэсівам ні адна.

Быццам цацкі з елачкі ў дзень Каляд,
Тры сьлязы ўпрыгожвалі далягляд.

Пахісьніся, месячык, тры разы
І страсі на дол тыя тры сьлязы.

Ім аддасьць зямля свой вясновы ўздых –
І памкне рака са сьлязінаў тых.

Панясе чаўны і залье шляхі,
І апошні крык кіне ў вір ліхі,

Невады парве і кашы з лазы…
А было ўсяго толькі тры сьлязы.

Гэй, каго паром праз раку вязе?
Як плывецца вам на маёй сьлязе?..

## ЦІШЫНЯ

На вежы касьцельнай –
Звон анямелы бяз біла.

І касьцёл праз шырокае поле
Доўга цягнуўся
І ўрэшце дасяг сваёй мэты –
Хоць крыжам адным
Адлюстравацца ў возеры.

Стаю і слухаю,
Як ціха шапаціць
У рэзгінах бярозы
Сена дажджу.

## ЛЕТА

Па ярах і далах пошум ніцы.
Поўдзень сьцішыўся мнагагалосы.
Промні сонца і промні пшаніцы
Запляліся ў супольныя косы.

Пры дарозе забытае прасла
Выгравае на сонцы сукі.
А між тых залатых перавяслаў
Песьні Богу пяюць жаўрукі.

## ВОСЕНЬ

*Віктару Вабішчэвічу*

За Давыд-Гарадком у возеры
Лес адмочвае чуб іржавы.
Дождж сабралі і павывозілі
Хмары – сонныя дырыжаблі.

На балоце, дзе сьпее ягада,
Дзе таемная дрэмле сіла,
Журавель узьлятаў, як пагада, –
Ціха-плаўна-шырокакрыла.

## СЭРЦЫ

***I***

Загадкавы польскі звычай:
Вялікіх палякаў
Хаваюць у розных месцах –
Па частках.

І насамрэч,
Каму ён паскардзіцца,
Бессардэчны нябожчык?

І пульсуе сэрца Шапэна
У варшаўскім касьцёле
Сьвятога Крыжа,
Ажно ўздрыгваюць
Мармуровыя скляпеньні.

І марнее ў каменным мяшку
У крыпце касьцельнай
Сэрца прафесара Лелявеля.
А ён у сэрцы тым самым
Выношваў дэвіз:
“За нашу і вашу свабоду!”

І б’ецца сэрца Пілсудскага
На віленскіх могілках Роса.
Іх насельнікі без піетэту
Паводзяць сябе,
Бо тут Polska zginela.

**I**

З Мікашэвічаў ён ці з Карары –
Мармур дасупакоіць імша.
Ружа сэрца ня хоча ў гербарый!
Матыльком над ёй кружыць душа.

Скрыпка. Смык. Мілажальнае скерца.
Цьвердзь зямную пранізвае крык.
Пан Шапэн быў схапіўся за сэрца, –
Але сэрца няма, Фрэдэрык.

## ГАРАДОК НАД ГАРЫНЬНЮ

*Леаніду Дранько-Майсюку*

**I**

Гэта бачыў хіба Адысей,
Калі карабель ягоны
Урос у пясчаны бераг
Празьмерна гасьціннай выспы.

Ільсьніцца на сонцы Гарынь.
Што сьніцца вам, лодкі старыя?
З вас, нібы з вазаў, дрэвы растуць.
Вярба ўкаранілася на карме –
Самы надзейны якар.

Створаны з гліны – і станеш зямлёй.
Зроблены з дрэва – і вернешся ў дрэва.
Агонь імкнецца да сонца.
І толькі вада, як першаматэрыя,
Плыве і плыве бясконца.

**I**

Як ты блешню памяці ні кідай,
Летапісны ловіцца радок:
Смуткаваў Давыдаў Гарадок,
Калі тут памёр паэт Авідый.

Не палохаў пойменны разьліў,
Вецер не разьдзьмухваў папялішчы –
Тыя ж вербы над ракой расьлі,
І чаўны на сонцы грэлі днішчы.

Чула сонцавокая Гарынь
Цётак галасы, што сена грэблі.
Verba – адгукаецца латынь,
Вербамі ня грэбуе ля грэблі.

Дзень ідзе ў надрэчны халадок,
А дзятва – на замчышча ў атаку.
І відно – Авідый-Гарадок
Прапісаўся на дарожным знаку.

## СЫНКАВІЧЫ

Да самоты храм за стагоддзі звык.
На муроўцы відзён лапік сьвежы.
Ці засіліўся, ці праглынуў язык –
Звон маўчыць на высокае вежы.

Да якое ён маўчацьме пары?
Долу хоча дахоўка зваліцца.
Неўзабаве вырастуць шчыпяры
На цыбулепадобнай званіцы.

Па цьвінтарнай маларослай траве
Малачай неабачліва скача.
Праз дарогу ў загоне статак раве –
На ўсяночную хоча, няйначай.

Паўтарае царква радзей і радзей
Малітоўна-вячыстыя словы.
Памаліцеся за бязбожных людзей,
Поле, ліпы старыя, каровы.

Хоць адзін прыход а дастаўся й вам.
Як мяжа, пралягла дарога.
Хмараломна высіцца ў неба храм
Непрыступным каўчэгам Бога!

## НА АД’ЕЗД З ЛУНІНЦА

*Тацяне Канапацкай*

У імя Сьвятога Духа,
Сына і Айца,
Пройдзе хай бяда і скруха
Міма Лунінца!

Неба ластаўкаю сшыта,
Пад нагамі – цьвердзь.
Несьмяротна сьпее жыта
Над рачулкай Сьмердзь.

Галілея разумею,
Ды сярод раўнін
Болей веру Пталемею,
Што зямля – як блін.

Бачыць вока, чуе вуха
Ўсіх, хто з Лунінца.
Там і чарка-расхадуха
П’ецца без канца.

– Хто ты будзеш? – Акавіта.
– А з чаго ты будзеш? – З жыта.
– Пашпарт пакажы. – Няма.
– Раз няма, табе – турма!

Не гудзе ў таполях гонкіх,
Сьпіць даўно шаша.

І трымціць, уся ў жаўронках,
І пяе душа.

## МЕЧ

Грахі зямныя цяжкія, як гіры.
Калі ж імя зьняславіў і свой род,
Японец учыняе харакіры –
Мячом кароткім б’е сябе ў жывот.

З Краіны Узыходзячага Сонца
Па ўласнае ахвоце самурай
Бяз роздумаў трапляе сам у рай.
Я разумею мужнага японца.

А тут ня проста выквацаў гербоўнік,
А сам у брудзе з галавы да ног,
Васпасіяна верны пасьлядоўнік,
І не перажывае – бачыць Бог.

А тут накрэсьлена на лобе: Каін,
І сківаца асьліная ў руцэ.
А мы з хлусьнёй дакучлівай звыкаем,
Як з мушкай-зелянушкаю цэцэ.

Ды прыйдзе час, і кемлівага дзеда
Унук падсадзіць высьпяткам на печ,
Падаўшы з міскай-лыжкай да абеда
І абасечны самурайскі меч!

## ОДА ЛАЗЬНІ

Як вярнуся здалёк дамоў, –
Пыл дарог абтрасу далоў,
Ці пясок, аці сапрапель
З мора Чорнага ці саванны…
Не завабіць мяне ў купель
Дамавіна чыгуннай ванны.

Далікатным дажджом ня руш
Маё цела, бяздушны душ!
Дробных таксападобных ножак
Ёй бракуе, і ўвесь кураж,

Ванна – гэта пракрустаў ложак:
Не ўмяшчаешся, як ні ляж.

Лазьня ж – як біблейскі чысьцец.
Трэба ў лазьні бываць часьцей.
У парыльні – вароты ў рай,
Нібы выйшлі на волю вязьні…
Хвошча венікаў цэлы гай.
Я люблю лістапад, што ў лазьні!

Толькі ў лазьні мы ўсе – адно.
Толькі ў лазьні усё відно.
Лазьня – сьвята ў будзённы дзень.
Лазьня ў дружбе – асноў аснова.
Толькі ў лазьні сквірчыць камень.
Толькі ў лазьні – свабода слова.

Скажам шчыра: усе мы з хат,
Дзе часамі – матрыярхат…
А ты ведай сабе цану
І сваіх не губляй амбіцый.
Захінуўшыся ў прасьціну,
У прымыльніку ты – патрыцый!

Ёсьць і ў лазьні пан-гаспадар –
Чуб бялявы, чырвоны твар.
Ён агню і вадзіцы брат,
Ён палка й камінка уласьнік,
Ён папарыцца з вамі рад –
Дабрадушны, вясёлы Лазьнік.

Ён нячысьцікам не радня.
Лазьнік мыецца сам – штодня.
На Люцыпаравым пайку
Лазьня век не была, паверце.
Хто пяклуецца на палку –
Таго ў пекла ня возьмуць чэрці!

**ОДА БАРАЗЬНЕ**

*Памяці*
*Віктара Аляксандравіча Матыліцкага*

О баразна – беларускі акоп!
Хай дыктатура ці мор у краіне,

Хай землятрус ці сусьветны патоп –
А беларус баразны не пакіне.

Хай сабе скогат зубоўны ці плач
Зранку да вечара ў роднай старонцы –
Зброя адна ў беларуса – капач,
Поза – паклон паясны і бясконцы.

Пнецца ў сваю баразну маладзён.
Пхнецца дзядок, хоць і ўсьпёрся на кульбу.
Хоць над ляском ужо месяц відзён,
Людзі шукаюць, як золата, бульбу.

Не зачапай, не цьвялі, не трывож.
Не дакучай на цымбалах ці лірах.
Глянь, як ляцяць самародкі у кош –
Будуць і клёцкі, і бульба ў мундзірах.

О баразна, наш прытулак і схоў!
Дзе, як сьвярэпка, расьлі пакаленьні.
Не вызнаваў аніякіх багоў
Дзядзька, а ў полі дык стаў на калені!

Гэй, маладзіца, спускаецца змрок.
Воз запазьнелы рыпіць на дарозе.
Позірк лагодны і стомлены крок –
Колькі ж чакаць у спакусьлівай позе?

О баразна, эратычны пейзаж!
Ты нам штовосень – і пеклам, і раем.
Поле – штодзень, навакол і наўсьцяж,
Дзе мы кахаем, жывем, паміраем.

Рукі ў парэпінах, зморшчаны лоб,
Іншых памкненьняў няма ані знаку.
О баразна – беларускі акоп,
Скуль нам аднойчы ісьці у атаку.